ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (850) ● Чацвер, 18 мая 1972 г. ● Год выдання XXV ● Цана 2 кап.

Мітынг салідарнасці з народам гераічнага В'етнама ў галоўным корпусе універсітэта.

Фота Д. Чаховіча.

НАРОД В'ЕТНАМА НЕПЕРАМОЖНЫ!

Ва універсітэце адбыўся мнагалюдны мітынг салідарнасці з народам гераічнага В'етнама. Мітынг адкрыў сакратар парткома універсітэта М. К. Гарбачоў. Ён выказаў гарачую падтрымку гераічнаму в'етнамскаму народу.

Прафесар В. Р. Заўрыеў, якому давялося на працягу года працаваць у ДРВ, расказаў аб мужнасці і стойкасці патрыётаў В'етнама.

— Мы па-ранейшаму засталіся вернымі сябрамі в'етнамскага народа і горача падтрымліваем і адабраем меры Савецкага Саюза па аказанню дапамогі гераічнаму народу. З глыбокім задавальненнем мы ўспрынялі заяву Савецкага ўрада.

Ад імя калектыву супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ доктар юрыдычных навук прафесар І. І. Марціновіч рашуча асудзіла грубае парушэнне свабоды міжнароднага суднаходства і патрабавала неадкладна спыніць бамбардзіроўкі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

Выступаючы на мітынгу, студэнт V курса гістарычнага факультэта Леанід Давыдзенка сказаў:

— Я быў у Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам у канцы мінулага года. Наша камсамольская дэлегацыя наведала гарады Ханой, Хайфон, а таксама некаторыя правінцыі гэтай краіны. Мы сваімі вачыма бачылі сляды варварскіх бамбардзіровак амерыканскай авіяцыяй. І калі мы, студэнты, даведаліся аб новым расшырэнні агрэсіі ЗША ў В'етнаме, то абурыліся да глыбіні душы.

Мы патрабуем неадкладнага спынення ваенных дзеянняў супраць ДРВ!

У адзінадушна прынятай рэзалюцыі мітынгу гаворыцца: «...Мы жадаем непахісным абаронцам ДРВ далейшых перамог у адпоры амерыканскай агрэсіі.

Мы адабраем і горача падтрымліваем заяву Савецкага ўрада і патрабуем спыніць агрэсію ў В'етнаме...

Справядлівая барацьба гераічнага народа В'етнама пераможа!».

В. КАЛАДЗІНСКІ.

СССР 50

СЯБРЫ СУСТРАКАЮЦЦА ЗНОЎ

Здаецца, зусім нядаўна нас віталі на гасціннай літоўскай зямлі, а сёння студэнты Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта — нашы госці. На пероне Мінскага вакзала іх сустрэлі кветкамі дзяўчаты ў нацыянальным беларускім убранні.

Вечарам, пасля кароткага знаёмства гасцей з горадам, у актавай зале адбыўся мітынг беларуска-літоўскай дружбы.

Шчырае прывітанне і шмат добрых пажаданняў ад калектыву выкладчыкаў і студэнтаў ВДУ перадаў рэктар І. П. Кубілюс. Ён расказаў аб гісторыі стварэння свайго універсітэта, падарыў партрэт В. Капсукаса, чыё імя носіць ВДУ.

— Гэта сустрэча, — сказаў рэктар нашага універсітэта А. Н. Сеўчанка, — носіць гістарычны характар. Яна гаворыць аб моцных сувязях паміж народамі нашай краіны. Абмен вопытам, сумеснае рашэнне навуковых праблем і іншых пытанняў дапамагаюць нам упэўнена развіваць навуку, выхоўваць новае пакаленне маладых будаўнікоў камунізму.

З плошчы Гедэмінаса, са старажытных вуліц Вільюса прывёз сваё прывітанне заслужаны ансамбль песні і танца Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам Вітаса Александравічуса.

Здаецца, водар лугоў, пах зямлі і саму гісторыю прынеслі на сцэну залы дзяўчаты і хлопцы ў нацыянальным літоўскім убранні. Сама Літва, мужная, працавітая, песенная, танцавала і спявала зараз.

Абрадавы вясельны танец змяняецца вясёлай літоўскай полькай і польскім кракавякам, літоўскія песні — рускай народнай «Свеціць светлы месяц» і беларускім «Янкам».

В наш круг, друзья,
В наш круг, друзья,
Ведь мы одна семья! —

спяваюць на сцэне, і зала, стоячы, апладзіруе.

Моладзь ёсць моладзь. Як бы ні стаміўся за дзень, калі гучыць добрая музыка, ногі самі просяцца ў скокі. Вечар працягваўся вясёлым застоллем, дзе ў адным хоры зліліся літоўскія і беларускія песні.

У нядзелю госці пабывалі ў Хатыні і наведалі Курган Славы, усклалі вянок да помніка загінуўшым воінам і партызанам на плошчы Перамогі, наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Развітваючыся, сакратар камітэта камсамола БДУ А. Слука сказаў:

— Мы не гаворым «бывайце!», а гаворым «да пабачэння!» Да новых, хуткіх сустрэч!

Л. ДРУЗЕВА.



САЛЮТ, ПІЯНЕРЫЯ!

50

ПА ЛЕНІНСКАМУ ЗАПАВЕТУ

19 мая спаўняецца 50 год Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна. Цяпер яна аб'ядноўвае ў сваіх радах 23 мільёны дзяцей. Ордэн Леніна на піянерскім сцягу — усенароднае прызнанне яе заслуг, якія з'явіліся вынікам пастаянных клопатаў і ўвагі Камуністычнай партыі і камсамола, паўсядзённай працы многіх тысяч энтузіястаў-актывістаў.

Значны ўклад у выхаванне юных ленінцаў уносіць калектыў нашага універсітэта. Ён падтрымлівае цесную сувязь са школамі, палацамі піянераў, з піянерскімі пакоямі. Дружба гэта носіць традыцыйны характар. Штогод 700-750 студэнтаў працуюць атраднымі важатымі. У загарадных і гарадскіх піянерскіх лагерах, піянерскіх пакоях пры домакіраўніцтвах, на дзіцячых аздараўленчых пляцоўках, у міжкалгасных піянерскіх лагерах рэспублікі можна сустрэць студэнтаў універсітэта. Разам з педагогамі яны клапоцяцца аб арганізацыі карыснага адпачынку рабят і ўмацаванні іх здароўя і адначасова прывіваюць ім працоўныя, турысцкія навыкі, развіваюць пачуцці калектывізму, пашыраюць кругагляд, паглыбляюць веды аб роднай прыродзе, камуністычным будаўніцтве ў нашай краіне.

Вялікую ўвагу ўдзяляюць студэнты выхаванню ў дзяцей высокіх маральных якасцей на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, рэвалюцыйных і працоўных традыцый савецкага народа. У час турысцкіх паходаў па месцах баявой і працоўнай славы нашага народа студэнты арганізуюць сустрэчы рабят з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, з ветэранамі працы, праводзяць кастры на месцах партызанскіх стаянак. Разам са студэнтамі-важатымі адпраўляюцца ў паходы «зялёныя патрулі» і звенні юных натуралістаў. Пад кіраўніцтвам важатых піянеры ахвотна дапамагаюць калгасам і саўгасам ва ўборцы ўраджаю, збіраюць матэрыял для школьных краязнаўчых музеяў і куткоў.

У час летняга працоўнага семестра нашы студэнты арганізуюць лагеры-спадарожнікі і праводзяць там цікавую работу. Разам са школьнікамі яны афармляюць кабінеты і будуюць спартыўныя пляцоўкі, умела арганізуюць адпачынак рабят. І не дзіўна, што гэты від студэнцкай дзейнасці не менш высакародны, чым будаўніцтва ці дапамога калгасам.

Штогод у перыяд студэнцкіх канікул партком сумесна з камітэтам камсамола арганізуюць агітпаходы, агітпрабегі, удзельнікі якіх сустракаюцца з піянерамі, праводзяць з імі гутаркі, выступаюць з канцэртамі, дапамагаюць парадамі і сваёй працаі у неадкладных піянерскіх справах. Толькі ў гэтым годзе ў перыяд зімніх канікул нашы студэнты правялі 170 гутарак і лекцый для піянераў.

Кожны месяц з гутаркамі і канцэртамі выязджаюць студэнты і выкладчыкі ў падшэфныя школы Дзяржынскага. Стаўбцоўскага раёнаў.

Рыхтуючыся да піянерскага юбілею, кафедра педагогікі распрацавала тэматыку гутарак з падборам літаратуры: «З гісторыі піянерыі», «Памяці загінуўшых будзьце вернымі», «Ці ведаеш ты свае песні?», «Сёння юнармеец — заўтра абаронца Радзімы», «Піянерская сімволіка, атрыбутыка, рытуалы і цырыманіялы» (гутаркі і ранішнікі). Па гэтай тэматыцы студэнты сёлета правялі 700 гутарак. Вялікую дапамогу ў падборы літаратуры, састаўленні рэкамендацыйных спісаў аказвае бібліятэка.

Заслугоўвае пахвалы шэфскі сектар камітэта камсамола, які ўзначальвае У. Галубовіч. На працягу гэтага навучальнага года 600 студэнтаў працуюць важатымі ў атрадах, піянерскіх пакоях пры домакіраўніцтвах, кіруюць гуркамі ў падшэфных школах Кастрычніцкага і Заводскага раёнаў.

18 красавіка камітэт камсамола праводзіў ва універсітэце злёт правафланговых атрадаў падшэфных школ Мінска. Атрады рапартавалі аб сваёй рабоце ў юбілейным годзе, а шэфы пазнаёмілі піянераў з музеямі, лабараторыямі універсітэта. 22 красавіка дружына 1-й СШ Мінска ўрачыста правяла ва універсітэце прыём у піянеры.

Асабліва актыўна працуюць з юнымі ленінцамі студэнты Ю. Казакоў, В. Сямякіна, А. Кругер, В. Крылоў, О. Данільчанка, Г. Семячка, Л. Кры-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

НА ЗДЫМКУ: сярод піянераў аспірант БДУ В. С. КЛІМОВІЧ.

ПА ЛЕНІНСКАМУ ЗАПАВЕТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

скевіч, Л. Тарасевіч, А. Жук, А. Александровіч, Т. Шман, В. Жураўская, Н. Сакалова і іншыя. Не застаюцца ў даўгу перад падрастаючым пакаленнем і нашы вучоныя, такія, як члены-карэспандэнты Акадэміі педагагічных навук СССР С. А. Умрэйка, Л. С. Абецэдарскі, прафесары А. Я. Малышаў, В. П. Якушка, В. Р. Заўрыеў, дацэнты М. П. Баранава, В. Ф. Цераховіч, Е. І. Тарасевіч. Яны выступаюць на старонках піянерскіх выданняў, у атрадах і дружынах.

Заваявалі папулярнасць сярод дзяцей піянерскага ўзросту аповесці, зборнікі апавяданняў, вершаў, песень, аўтарамі якіх з'яўляюцца член-карэспандэнт АН БССР І. Я. Навуменка, прафесар А. А. Лойка, дацэнты П. І. Ткачоў, І. В. Зазека, Н. С. Гілевіч.

Вялікую работу праводзіць універсітэт па выхаванню юных на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа. Частыя госці ў школах Мінска і рэспублікі Героі Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў, М. Я. Зайцаў, Д. П. Жмуроўскі, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны Р. В. Булацкі, У. Д. Мухаеў, А. І. Кажушкоў, С. А. Лысенка, М. У. Піскуноў, удзельнікі партызанскага руху дацэнты В. А. Захарава, Л. Л. Кароткая, Д. П. Багрова, І. В. Зазека.

Завязаліся цесныя сувязі з чырвонымі следапытамі — піянерамі Калінкавіцкага, Лоеўскага і Брэсцкага раёнаў. Выкладчыкі і супрацоўнікі аказалі дапамогу ў стварэнні музеяў народнай славы ў школах гэтых раёнаў. У лістападзе мінулага года адбылася сустрэча супрацоўнікаў універсітэта — ветэранаў Айчыннай вайны, былых удзельнікаў баёў на Дняпры, якія вызвалялі Лоеўскі раён ад фашысцкіх захопнікаў, Героя Савецкага Саюза А. В. Кірсанава і У. Д. Мухаева з піянерамі Бывалкаўскага сельсавета Лоеўскага раёна.

Асаблівую ролю ў рабоце са школьнікамі адыгрываюць заалагічны, гістарычны, мінералагічны музеі, батанічны сад і аранжарэя. Яны маюць 25.000 экспанатаў і прымаюць кожны год больш 10.000 юных экскурсантаў.

Біялагічны факультэт сумесна з таварыствам аховы прыроды праводзіць выстаўкі птушак, рыб, кветак, якія наведваюць школьнікі Мінска і прыгарадных раёнаў.

У музеях універсітэта праводзяцца тэматычныя і азнаямленчыя экскурсіі, іх супрацоўнікі аказваюць дапамогу ў арганізацыі школьных музеяў і куткоў, праводзяць атэістычную і турысцкую работу.

Вялікую дапамогу ў выхаванні юных аказваюць студэнты ў час праходжання педагагічнай практыкі. А гэта ж цэлая армія. Кожны год яна складае каля 2.500 чалавек.

Не абыходзіць рабят увагай і кафедра фізічнага выхавання і спорту. У секцыях па валейболу, гімнастыцы, баскетболу і іншых пад кіраўніцтвам вопытных трэнераў займаюцца 100 школьнікаў.

Кафедры факультэта журналістыкі, студэнты ў час практыкі многа працуюць з юнкорамі рэспублікі.

Заўсёды ў піянерскім страі летам нашы выкладчыкі М. З. Яноўскі, Я. Л. Прыбыткова, М. А. Шэйнеман, В. С. Клімовіч.

Да слаўнага юбілею піянерыі ва універсітэце падрыхтавана канферэнцыя, у якой прынялі актыўны ўдзел выкладчыкі, студэнты.

Сувязі універсітэта з юнымі будуць пашырацца і мацнець. Шматлікі калектыў універсітэта, які носіць імя У. І. Леніна, поўны рашучасці выканаць запаветы Ільіча — выхоўваць маладое пакаленне ў духу камунізму.

К. МАЗУРКЕВІЧ,
загадчык педагагічнай практыкі БДУ.



НА ЗДЫМКУ: студэнтка філфака Н. Гайдалёнак са сваімі выхаванцамі ў піянерлагеры «Дудзінка».

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Аб узнагароджанні тав. ДУДАРАВАЙ Т. Я. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

За актыўную навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць дэкана завочнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна тав. **Дударау** Таццяну Яфімаўну Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.

15 мая 1972 года.
гор. Мінск.

Адзін з клопатаў беларускіх студэнтаў, якія жывуць у адным інтэрнаце з замежнымі студэнтамі, — дапамагчы сваім сябрам лепш пазнаёміцца з нашай краінай. І ў гэтым немалую ролю адыгрывае наглядная агітацыя.
На здымку: студэнткі **Л. Яўзрэзава, В. Маркотава** і **С. Бязручка** рыхтуюць новы стэнд на падрыхтоўчым факультэце. Фота **М. Нечыпарэнкі.**

ЯКОЙ БУДЗЕ СТЫПЕНДЫЯ

У кастрычніку 1971 года Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў». Адпаведна рашэнню XXIV з'езда КПСС яна прадугледжвае новае значнае паляпшэнне ўмоў вучобы, быту і адпачынку будучых спецыялістаў у бягучай пяцігодцы. Кіруючыся ленінскімі ўказаннямі аб тым, што іменна моладзі прадстаіць выканаць задачу стварэння камуністычнага грамадства, Камуністычная партыя і Савецкі ўрад ніколі не шкадавалі сродкаў для навучання і выхавання моладзі, падрыхтоўкі спецыялістаў, бязмежна адданых справе сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. Дзяржава выдзяляе вялікія сродкі на будаўніцтва інтэрнатаў, сталовых, на выплату стыпендый.

У бягучай пяцігодцы ў нашым універсітэце, напрыклад, уведзен у эксплуатацыю інтэрнат на 1122 месцы, прадстаіць пабудаваць інтэрнат для маладых вучоных і аспірантаў, вучэбны корпус, інстытут прыкладной матэматыкі, інтэрнат для студэнтаў на 1132 месцы, а таксама рэканструяваць інтэрнаты па вуліцы Бабруйскай і Паркавай магістралі. Значна пашырыцца сетка сталовых і буфетаў.

З 1 верасня ўводзяцца павышаныя стыпендыі. У залежнасці ад курса навучання і спецыяльнасцей размер стыпендыі будзе састаўляць на I—IV курсах 40 рублёў, на V курсах — 45 рублёў. Павышаюцца таксама імянныя стыпендыі. Так, стыпендыі імя К. Маркса, імя У. І. Леніна будуць выплачвацца ў размеры 100 рублёў. Стыпендыі імя выдатных партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячоў, выплачваемыя студэнтам адпаведна рашэнню ўрада СССР, павялічваюцца да 75 рублёў, а ўстаноўленыя Саветам Міністраў саюзных рэспублік— да 65 рублёў у месяц.

К канцу 1975 года пашырыцца кола стыпендыятаў. 74 працэнты студэнтаў атрымаюць стыпендыі за кошт дзяржаўнага бюджэту.

З пачатку 1972—1973 навучальнага года ўводзіцца новы парадак назначэння на стыпендыю. Галоўным і вызначаючым фактарам пры гэтым будуць адносіны студэнтаў да вучобы, удзел іх у грамадскім жыцці факультэта. Чым лепш студэнт будзе вучыцца, чым грунтоўней вывучаць асновы навук, чым актыўней удзельнічаць у эксперыментальнай, навукова-даследчай рабоце, у грамадскім жыцці свайго калектыву, тым верагодней магчымасць атрымання стыпендыі.

Новы парадак назначэння на стыпендыю не выключае магчымасці ўлічваць і матэрыяльнае становішча студэнта. Але галоўным з'яўляюцца ўсё ж вынікі вучобы, паспяховасць, грамадская актыўнасць, дысцыплінаванасць. Дапамога маючым патрэбу студэнтам павінна здзяйсняцца са сродкаў, адлічаных са стыпендыяльнага фонду (і працэнт), а таксама са сродкаў прафесіянальных саюзаў.

Для заахвочвання студэнтаў, якія займаюцца на выдатна і добра і актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце і грамадскім жыцці калектыву, рэктару пры ўдзеле камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый дазволена ў асобных выпадках (у межах стыпендыяльнага фонду) павышаць гэтым студэнтам размер стыпендыі на 15 працэнтаў. Студэнтам, якія маюць па выніках экзаменацыйнай сесіі выдатныя адзнакі па ўсіх прадметах, стыпендыя павышаецца на 25 працэнтаў. Павялічваюцца стыпендыі для аспірантаў да 85 рублёў. Стыпендыі аспірантам, якія прыходзяць з вытворчасці, будуць выплачвацца ў ранейшых размерах.

Рэктарат універсітэта прымае меры па лепшай арганізацыі грамадскага харчавання з тым, каб давесці к 1975 году колькасць месц у буфетах і сталовых да ўстаноўленых нарматываў. Намячаецца палепшыць медыцынскае абслугоўванне, аздараўленча-спартыўную работу. Задача заключаецца ў тым, каб забяспечыць безумоўнае выкананне гэтых мерапрыемстваў.

В. ДАЛГАРУКАЎ,
начальнік вучэбнага аддзела.

У ІНТЭРНАЦЕ

Універсітэцкі інтэрнат па вул. Кастрычніцкай. У чацвёртым корпусе жывуць будучыя географы і юрысты. Калі ўваходзіш сюды, адразу звяртаеш увагу на плакат: «Студэнт! Не забывай, што інтэрнат — гэта твой дом». Сапраўды, так і атрымліваецца: каля паловы сутак студэнт праводзіць тут. А як праводзіць? Каб утульна, цікава, наогул, добра — аб гэтым клапоцяцца і студсавет на чале з чацвёртакурснікам Мікалаем Чаркасавым, і самі жыхары. Поўны парадак падтрымліваецца на калідоры і ў жылых пакоях. Ля ўваходу наладжана дзяжурства.

Добра аформлены ленінскі пакой, дзе мяркуецца паставіць каляровы тэлевізар, прыцягвае студэнтаў. Тут можна пачытаць свежы часопіс, газету, пасядзець з цікавай кнігай.

Поўная цішыня стаіць у чытальнай зале і на калідорах, калі ідзе падрыхтоўка да семінарскіх і практычных заняткаў. Дарэчы, сесія на геафаку ідзе поўным ходам.

Побач з інтэрнатам спартыўная пляцоўка, дзе можна згуляць у валейбол ці баскетбол, паганяць футбольны мяч, выявіць мацнейшага бадмінтаніста.

Вечарамі дзесяткі балельшчыкаў назіраюць за ходам шахматнага турніру, які арганізаван камітэтам камсамола геафака і студсаветам. Добра выступаюць А. Міхуноў (II курс), П. Ксяндзоў (III курс) і В. Малаш (IV курс). Яны — лідэры спаборніцтваў.

У. СКУЛЬБЕДАЎ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

РАБОТА З КАМСАМОЛАМ — У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Партыйнае бюро хімічнага факультэта ўсю сваю работу будуе такім чынам, каб усямерна садзейнічаць падрыхтоўцы ў сценах універсітэта людзей, якія дасканала валодаюць сваёй спецыяльнасцю і асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, добрых арганізатараў вытворчасці, якія вызначаюцца і высокім культурным узроўнем. Л. І. Брэжнеў у сваёй прамове на Усесаюзным злёце студэнтаў падкрэсліў, што камуністаў вну павінны цікавіць пытанні вучобы і адпачынку студэнтаў, іх навуковая і грамадская работа. І партыйнае бюро стараецца не ўпускаць з поля зроку гэтыя бакі студэнцкага жыцця.

Поспех работы факультэта ў многім вызначаецца зладжанай работай камсамольскай арганізацыі, што дасягаецца правільным падборам камсамольскага актыву, дакладным планаванням работы і добра наладжаным кантролем. Усе гэтыя пытанні знаходзяцца ў цэнтры ўвагі партыйнага бюро. На пасяджэннях партбюро рэгулярна разглядаюцца і зацвярджаюцца планы работы камітэта камсамола. Камуністы факультэта на адным з партыйных сходаў абмеркавалі даклад сакратара камітэта камсамола О. Шадыры аб рабоце па выхаванню грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольцаў. На пасяджэннях партбюро была заслухана работа камсамольскіх груп першага і другога курсаў па арганізацыі самастойнай вучобы і грамадскай работы.

Многа ўвагі ўдзяляюць камуністы арганізацыі і правядзенню такіх масавых мерапрыемстваў у жыцці камсамола, як Ленінскі залік, Ленінскі суботнік, здача норм ГПА, фарміраванне СБА. Гэта работа праводзіцца пад кіраўніцтвам куратараў студэнцкіх груп, выдзеленых і зацверджаных партыйным бюро. Акрамя таго, партыйнае бюро за кожнай камсамольскай групай замацавала камуніста для аказання канкрэтнай дапамогі групоргу ў наладжванні работы. Замацаваныя да груп камуністы прынялі актыўны ўдзел у правядзенні камсамольскіх сходаў па прыняццю Ленінскага заліку. Вынікі здачы заліку былі падведзены на агульным сходзе факультэта.

Партыйнае бюро заслухала інфармацыю аб правядзенні суботніка. Быў распрацаван і зацверджан план-графік работы на замацавных аб'ектах. Правільная арганізацыя дазволіла правесці суботнік актыўна і зладжана. За добрую работу дырэкцыя завода аб'явіла падзяку студэнтам нашага факультэта.

Да цяперашняга часу ўкамплектаваны ўсе планавыя СБА і на пасяджэнні партбюро зацверджаны кандыдатуры камандзіраў і камісараў гэтых атрадаў.

Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем рабоце камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў. Факультэт наш маладзёжны, каля 50 працэнтаў супрацоўнікаў — камсамольцы. На працягу раду год супрацоўнікі-камсамольцы не праяўлялі актыўнасці ў грамадскім жыцці факультэта. У гэтым годзе, дзякуючы вялікай ўвазе партбюро, работа камсамольскай арганізацыі прыкметна ажывілася. Партыйны сход заслухаў пытанне аб рабоце камсамольскага бюро супрацоўнікаў. Ход выканання рашэнняў гэтага сходу абмяркоўваўся на пасяджэнні партбюро. Хочацца адзначыць, што намаганнямі камсамольскага бюро быў створан савет маладых вучоных, праведзен агітпаход па Мінскай вобласці, прысвечаны дню Савецкай Арміі, арганізаван шэраг лекцый.

Партыйнае бюро ўдзяляе вялікую ўвагу рабоце студсавета інтэрната № 6. У сакавіку было праведзена сумеснае пасяджэнне партыйнага і прафсаюзнага бюро факультэта, студсавета і стараст паверхаў і пакояў. Разам абмеркавалі, як палепшыць работу студсавета і санітарны стан інтэрната. Створана факультэцкая пастаянна дзейнічаючая камісія, якая правярае работу студсавета, аказвае яму неабходную дапамогу ў навядзенні ўзорнага парадку.

Члены партыйнага бюро падтрымліваюць пастаянную сувязь з камітэтам камсамола, курсавымі і групавымі камсамольскімі арганізацыямі, прымаюць удзел у абмеркаванні шэрагу пытанняў на пасяджэннях камітэта камсамола і камсамольскіх сходах.

У маі праводзіцца справаздачна-выбарная кампанія ў курсавых і групавых камсамольскіх арганізацыях, таму ў цяперашні час партбюро сумесна з камітэтам камсамола займаецца падборам камсамольскага актыву.

В. ШЛЫК,
сакратар партбюро хімфака.
В. СІДЭРКА,
член партбюро, адказная за работу з камсамолам.

У ДАСЛЕДАВАННЯХ ФІЛОЛАГАЎ...

Ужо больш дваццаці год студэнты - філолагі вывучаюць балгарскую мову, што дае ім магчымасць чытаць творы балгарскіх паэтаў і празаікаў у арыгінале. Даўно на філфаку вядомы і страсныя Боцеўскія словы аб тых, «кто пал за свободу», і запавет Н. Вапцарава, звернуты да народа, і задушэўныя лірычныя радкі з «Вершаў у абоймах» В. Ханчава. На нашых вечарах самадзейнасці разам з вершамі рускіх і беларускіх паэтаў чуюцца балгарскія вершы і песні. У сценах нашага універсітэта вырас і буйнейшы ў Беларусі паэт-перакладчык Ніл Сямёнавіч Гілевіч, якога за вялікую і нястомную працу ў галіне перакладу урад Балгарскай Народнай Рэспублікі ўзнагародзіў ордэнам Кірылы і Мяфодзія.

На філалагічным факультэце больш дваццаці год чытаецца спецкурс па славянскіх літаратурах, у якім прыкметнае, калі не сказаць большае, месца займае балгарская літаратура. Назва гэтага курса мянялася, але нязменным заставалася адно — абавязковае азнаямленне студэнтаў то з балгарскай літаратурай, то з яе гісторыяй, то з яе сённяшнім днём. У цяперашні час у спецкурсе «Літаратура сацыялістычных краін» значнае месца ўдзелена балгарскай сучаснай літаратуры, развіццё і поспехі якой разглядаюцца на фоне развіцця іншых літаратур.

Частка студэнтаў удзельнічае ў спецсемінары «Раман у літаратуры сацыялістычных краін» і працуе над тэмамі, звязанымі з сучаснай балгарскай прозай.

За два дзесяцігоддзі на філфаку напісаны і абаронены дыпломныя работы, аб'ектам вывучэння якіх стала творчасць многіх балгарскіх пісьменнікаў. Яшчэ ў самым пачатку 50-х гадоў студэнты захапляліся публіцыстыкай і вершамі Хрыста Боцева, раманам І. Вазава «Пад ігам», апавяданнямі Елін-Пеліна, пралетарскай паэзіяй Хрыста Смірненскага, літаратурнай і рэвалюцыйнай дзейнасцю Н. Вапцарава. Цяжка, бадай, назваць вялікага балгарскага пісьменніка, творчасць якога не была б даследавана адным з дыпломнікаў за гэтыя гады. Беларуска - балгарскія літаратурныя сувязі, сучасная паэзія, раман-эпапея — усё гэта цікавіць студэнта - філолага.

У гэтым годзе амаль закончана дыпломная работа студэнткі Л. Уладзіміравай «Раманы Камена Калчава», а ў будучым годзе плён будзе больш багатым —В. Хвашчэўская піша дыпломную работу аб творчасці буйнейшага пісьменніка Балгарыі Г. Караславава, А. Мельнік — аб раманах С. Загарчынава і г. д. Аспірантам У. Ганчаровым напісана кандыдацкая дысертацыя аб балгарскім гістарычным рамане.

З кожным годам узрастае ў студэнтаў зацікаўленасць да літаратуры балгарскіх сяброў. Зроблена нямала, трэба будзе зрабіць яшчэ больш.

В. ЦІМАФЕЕВА,
дацэнт.

22 мая ў 19 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца вечар балгарскай літаратуры.
Запрашаем студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў прыняць удзел у гэтым вечары.
Аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы.

МАЦНЕЕ ДРУЖБА БРАТНІХ УНІВЕРСІТЭТАЎ

УМАЦАВАННЕ сувязей паміж нашым і Сафійскім універсітэтамі узаемна ўзбагачае сяброўскія калектывы. Вельмі карысныя абмен спецыялістамі, стажыроўка выкладчыкаў, абмен студэнцкімі групамі і г. д.

У мінулым годзе, напрыклад, прафесар М. Г. Булахаў і дацэнт П. П. Шуба прынялі ўдзел у сімпозіуме «Лінгвістычныя і метадычныя праблемы інтэрферэнцыі роднай мовы пры вывучэнні рускай мовы славянамі», які адбыўся ў горадзе Вяліка Тырнава. Кандыдат эканамічных навук Я. Б. Асіпкоў стажыруецца цяпер у Сафійскім універсітэце.

У нашым універсітэце завяршыў кандыдацкую дысертацыю па прыкладной матэматыцы Іардан Пятроў Дзімітраў (навуковы кіраўнік прафесар Р. Ф. Габасаў). Прафесар М. Ф. Авакаў і дацэнт А. А. Галаўко далі водзыў на кандыдацкую дысертацыю на тэму «Права на самавызначэнне каланіяльных і залежных народаў» балгарскаму юрысту Ангелу Шышкаву. Прафесар М. Г. Булахаў сістэматычна кансультуе выкладчыка універсітэта ў Вяліка Тырнава Міхаіла Міхайлава па кандыдацкай дысертацыі на тэму «Слова аб палку Ігаравым у балгарскіх перакладах».

Дацэнт В. В. Рэвіцкі, ст. выкладчыкі Э. Г. Іванова і Т. А. Клачкова былі камандзіраваны ў Балгарыю для выкладання на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў рускай мовы.

У цяперашні час на факультэце прыкладной матэматыкі вучацца 15 балгарскіх студэнтаў, якія атрымаюць спецыяльнасць, так неабходную для народнай гаспадаркі Балгарыі.

Вельмі карысны абмен студэнтамі ў час студэнцкай практыкі. У мінулым годзе нашы універсітэты абменьваліся дзвюма групамі студэнтаў-хімікаў і географаў.

Характэрна, што балгарская тэматыка з'яўляецца прадметам навуковага даследавання многіх выкладчыкаў гістарычнага, філалагічнага, геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў, грамадскіх кафедр. Сярод іх прафесары А. Я. Супрун, М. Г. Булахаў, М. Р. Ларчанка, В. Р. Заўрыеў, М. Т. Раманоўскі, дацэнты Н. С. Гілевіч, В. М. Цімафеева, А. А. Галаўко, М. П. Квочкін і іншыя.

Сярод апублікаваных у 1971 годзе работ можна адзначыць артыкулы В. М. Цімафеевай «Ленінская тэма ў творчасці Г. Караславава», У. І. Ганчарова «Стаян Загарчынаў аб гістарычным рамане». Кандыдат філалагічных навук Б. Ю. Норман завяршыў манаграфію «Пераходнасць. Стан. Зваротнасць» (на матэрыяле балгарскай і іншых моў).

Зроблены пэўныя крокі ў падрыхтоўцы сумесных навуковых даследаванняў.

Шырокі кнігаабмен вядзе бібліятэка БДУ з бібліятэкамі Сафійскага універсітэта, Балгарскай акадэміі навук, Плоўдзіўскага вышэйшага педагагічнага інстытута. На працягу года бібліятэка універсітэта накіравала балгарскім сябрам 50 экземпляраў кніг.

У снежні 1971 года універсітэт наведалі прарэктар Сафійскага універсітэта Эміл Георгіеў і сакратар парткома Весяліна Брэскоўска. Яны азнаёміліся з работай рэктарата, парткома універсітэта, абмяняліся вопытам пастаноўкі вучэбна-метадычнай, навуковай і выхаваўчай работы. Была падпісана праграма супрацоўніцтва паміж Беларускім і Сафійскім універсітэтамі на 1972-1973 гады.

Значны ўклад у развіццё сяброўскіх сувязей паміж Беларускім і Сафійскім універсітэтамі ўносіць аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы, старшынёй якога з'яўляецца рэктар БДУ акадэмік АН БССР, Герой Сацыялістычнай Працы А. Н. Сеўчанка.

Сёлета, як і ў мінулыя гады, аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы працягвала знаёміць калектыў універсітэта з дасягненнямі НРБ на этапе завяршэння будаўніцтва сацыялізму, прапагандавала рашэнні X з'езда БКП.

На гістарычным факультэце была адкрыта аўдыторыя савецка-балгарскай дружбы. У ёй экспануюцца фотавыстаўкі, якія расказваюць аб поспехах балгарскага народа ў будаўніцтве сацыялізму, аб сяброўскіх сувязях Беларусі і Балгарыі, аб супрацоўніцтве Беларускага і Сафійскага універсітэтаў. У вітрынах дэманструюцца работы вучоных БДУ па балгарскай тэматыцы, у тым ліку апублікаваныя ў Балгарыі, падарункі, зробленыя балгарскімі дэлегацыямі. Тут ёсць кнігі па гісторыі Балгарыі, мастацкая літаратура. Студэнты маюць магчымасць рэгулярна чытаць балгарскія газеты і часопісы.

Ва універсітэце шырока адзначаны 23-я і 24-я гадавіны Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і НРБ, Дзень балгарскай культуры, асветы і славянскай пісьменнасці, 27-я гадавіна сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі. На факультэтах, у групах былі праведзены лекцыі і гутаркі аб дасягненнях балгарскага народа ў эканоміцы і культуры, аб савецка-балгарскай дружбе і супрацоўніцтве, аб ролі Беларускай ССР у іх умацаванні.

Ва універсітэце былі адзначаны такія знамянальныя даты ў жыцці балгарскага народа, як 80-годдзе з дня заснавання марксісцкай партыі ў Балгарыі, 150-годдзе з дня нараджэння Георгія Ракоўскага. Да юбілейных дат універсітэцкая бібліятэка арганізавала шэраг кніжных выставак. Аддзяленне ТСБД сумесна з рэдкалегіяй газеты «Беларускі універсітэт» сістэматычна адзначалі гэтыя даты.

Вялікую цікавасць у студэнцтва універсітэта выклікае кіналекторый «Наш друг—сацыялістычная Балгарыя».

Паспяхова развіваюцца кантакты паміж камітэтам камсамола БДУ і камітэтам ДКСМ Сафійскага універсітэта. Абодва камітэты заключылі дагавор аб дружбе. Адпаведна яму гасцямі балгарскіх сяброў былі група камсамольскіх актывістаў і танцавальны ансамбль «Крыжачок». Сёлета універсітэты абменяюцца будаўнічымі атрадамі.

Развіццё традыцыйных сяброўскіх сувязей паміж Беларускім і Сафійскім універсітэтамі будзе яшчэ больш садзейнічаць збліжэнню і ўзаемнаму ўзбагачэнню працоўных Беларусі і Балгарыі.

Д. МЕЛЬЦАР,
намеснік старшыні аддзялення савецка-балгарскай дружбы БДУ, дацэнт.

ДНІ БАЛГАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БССР

ВЕРШЫ НАШЫХ ГАСЦЕЙ

Імёны паэтаў, якіх мы сёння прадстаўляем, добра вядомы беларускім аматарам паэзіі. Іх творы не аднойчы друкаваліся на старонках нашых рэспубліканскіх выданняў, а вершы Н. Вылчаў і І. Давыдкава нават выйшлі на беларускай мове асобнымі кнігамі. І Н. Вылчаў, і І. Давыдкаў, і А. Германаў з'яўляюцца самымі актыўнымі перакладчыкамі беларускай паэзіі ў Балгарыі. Дзякуючы іх клопатам у Сафіі на балгарскай мове выйшлі томікі паэзіі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, П. Броўкі, П. Панчанкі, А. Куляшова, Н. Гілевіча, зборнік «Беларускія паэты. Адно пакаленне» і іншыя. Нашы даўнія сябры зноў прыязджаюць у Беларусь — для ўдзелу ў Днях балгарскай літаратуры. Прапануем увазе чытачоў іх новыя вершы ў перакладах дацэнта кафедры беларускай літаратуры паэта Ніла ГІЛЕВІЧА.

Найдан ВЫЛЧАЎ

ЁН

Яму было не больш як дваццаць.
З гітарай, ладна абшарпанай,
(а дэка — поўнае лістовак),
ішоў з-пад крыл зары вячэрняй
у непраглядны змрок начны.
І чула нізкае акенца,
як ён пяшчотна падае
сігналы першага кахання.

Але сігнал пачуўся іншы.
І ён пайшоў далёка ў горы.
І не з гітарай —
з карабінам.
І стаў там кветкай на паляне,
а ў небе — зоркай зазіхцеў.

І нават нізкаму акенцу
ён не паспеў сказаць «бывай!»
Яму было не больш як дваццаць,
і ён не меў чаго пакінуць.
Таму пакінуў нам свабоду.

Іван ДАВЫДКАЎ

АРХЕАЛОГІЯ

Коні іржуць у фракійскіх магільных
скляпах.
Ад вострых падкоў іх са сцен
асыпаецца тынк.
Падыйдзем жа і паднясём ім аброк
у прыгоршчах:
далёкае ззянне начных гарадоў
і вакзалаў.

Больш тысячы год, як аброці сняць
поля прастор
і месяц уночы нагу закладае ў стрэмя.

Больш тысячы год у бясконцай дарозе
да нас.

«О, вы, што капаеце гэты забыты
курган,
знайшлі вы дзе-небудзь—пад каменем
ці пад карэннем —
крык тога фракійца, што ноччу ляцеў
наўзгалоп?
Знайшлі цень каханай, у ясным
паглядзе якой
усмешка яго калыхалася, нібы лісток,
узнесены ў неба гарачым дыханнем
яе?»

«Пад' кіркамі сыплецца ціха зямля.
Больш нічога.
І толькі асколачак вазы ўсміхаецца
вокам птушыным...»

Археалогія —мудрая, жорсткая вельмі
навука.
Страшна занятыя важнымі справамі,
мы
часу не маем для роздуму,
для цеплыні.

Некалі кірка і нас пашукае, магчыма.
Што ёй раскажуць сухія глыжы-камякі?
Будзе сцюдзёна. І месяц, сагнуўшыся,
будзе
коней фракійскіх па стуку падкоў
даганяць.

Андрэй ГЕРМАНАЎ

НАД БЕЗДАННЮ

Да стром віецца сцежка. Дождж
заціх.
Як бісерныя, зіхацяць травінкі,
і дрэў галіны сонцам перавіты...
Спакой, чмялі і мір... І ў нейкі міг,
раптоўна, з нейкай глыбіні глыбокай
цябе абдасць няясным халадком,
і ты замрэш, хлябнуўшы дых глытком,
і раўнавагі ўжо зялёнавокай
як не было...
Так, бездань блізка дзесь!
Нябачная, яна ўжо цягне — быццам
у тым жахлівым сне, што часам сніцца
перад світаннем, калі скора дзень!..

А ты — адчула, што яшчэ ступіць
крок, два — і сцежка ў бездань
абарвецца?
У словах гэта цяжка улавіць...

Але затахкала шалёна сэрца,
і быў аслепшы і аглухшы я,
пакуль у зманнасці салодка-п'янай
з тваёй душой, пад стрэлы слоў-
маланак,
судакраналася душа мая.

З БАЛГАРСКАГА ГУМАРУ

ЛЕКЦЫЮ ЧЫТАЕ СТУДЭНТ

За апошні час прыкметна актывізавалася работа навуковых гурткоў юрыдычнага факультэта. Вялікая работа вядзецца ў напрамку прапагандысцкай дзейнасці, якая ўключае чытанне лекцый у сярэдніх школах і ў розных установах і арганізацыях. Усяго студэнтамі юрыдычнага факультэта было прачытана 52 лекцыі. Загадам рэктара аб'яўлена падзяка найбольш актыўным студэнтам: А. Лукашову, А. Шчарбіне, В. Елісеенку. І тут хацелася б адзначыць студэнта IV курса В. Елісеенку, які прачытаў 28 лекцый у сярэдніх школах Мінска і Жлобіна. Агульная тэма лекцый — «Крымінальная адказнасць непаўналетніх па савецкаму крымінальнаму праву». Шматлікія водгукі сведчаць аб добрасумленнай падрыхтоўцы Валянціна, неабходнасці і карысці такіх мерапрыемстваў.

Разам з ім я пабываў у сярэдняй школе № 89 г. Мінска, дзе Валянцін чытаў вучням 9-га «А» класа сваю чарговую лекцыю.

...Сучасны будынак, вялікія, светлыя вокны... і кругом вясенняя гразь, па якой весела шлёпаюць першаклашкі — такой паўстала перад намі 89-я школа. Вучні 7—10-х класаў — людзі больш сталыя — старанна абыходзяць лужыны, многія вітаюцца з Валянцінам. Адчуваецца: ён тут чалавек свой. Праходзяць два «эмансіпіраваныя» хлопцы, дэманструючы даўно не мытыя космы. На момант спыняемся, размаўляем:

— Ну, як справы?

— У ажуры.

— Колькі далі?

— Паўтара года ўмоўна, жыць можна!

Ідуць далей з пачуццём выкананага доўгу, размахваючы партфелямі. А Валя растлумачвае, што адзін з толькі што сустрэтых хлопцаў быў прыцягнут да крымінальнай адказнасці за хуліганства.

І вось, нарэшце, 9-ы «А». Хлопаючы крышкамі парт, рабяты ўстаюць, з цікаўнасцю глядзяць на нас, дакладней, на мяне: Валя тут часты госць. Стараючыся быць непрыкметным, саджуся за апошнюю парту, вымаю аўтаручку і аўтарытэтна папраўляю акуляры.

Аўдыторыя стракатая, гаманлівая: тут і яўны другагоднік, які заўзята жуе чэрствую булачку, і класічная «камчатка» з нязменным «марскім боем», і непаседлівыя суседкі (зараз яны плятказараць, весела хіхікаючы, аб закаханай пары, што за трэцяй партай ля акна).

Так, цяжкавата будзе нашаму лектару: супраць яго голад, сум і любоў, заадно ў гэты спіс можна ўнесці і тое, што лекцыя ідзе сёмым урокам, а для школьніка, як і для студэнта, лішняя гадзіна смерці падобна. Пераключаю сваю ўвагу на Валянціна. Ён спакойны, упэўнены ў сабе. Штосьці гартае, потым рашуча захлопвае папку.

— Для пачатку паўторым тое, аб чым я расказаў вам у мінулы раз. І так, першае — кароткае азначэнне злачынства.

Устае тоненькая дзяўчынка з вялікімі зялёнымі вачыма, задорна аглядвае клас і хутка прагаворвае: «Злачынства — гэта парушэнне граніц дазволенага».— Уздыхнуўшы, шкадуючы аб тым, што азначэнне такое кароткае, садзіцца на месца.

— Добра. А з якіх год можна прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за зробленае злачынства? «Гэта... як яго, — мямліць заўзяты аматар «марскога бою» (прафесійны падказчык моцна шэпча з другога канца класа: «З чатырнаццаці»). — Во... з чатырнаццаці», — згаджаецца ён.

— За якія злачынствы?

— Ну, за бойку.

— Правільней будзе, за злоснае хуліганства. Ты згодзен са мной?

— Ага, за злоснае хуліганства.—Потым, успомніўшы, аблегчана: — Яшчэ за грабеж і разбой...

— Памятаеце, мы з вамі разглядалі рад злачынстваў. Сёння мы прааналізуем прычыны іх узнікнення.

...На імгненне адрываюся ад сшытка. У класе мёртвая цішыня. Цяпер я на практыцы пераканаўся, што такое «сіла слова». Любоў, сум, сёмы ўрок пакладзены цвёрдай рукой Валянціна на абедзве лапаткі.

«Вось дык Валя...» — думаю я і зноў заўзята хватаюся за аўтаручку.

— У канцы я хацеў бы параіць вам, акрамя расказаў пра Шэрлака Холмса, яшчэ адну не менш цікавую кнігу «Закон пра мяне і мне пра закон». Прачытайце таксама часопіс «Чалавек і закон». Я ўпэўнен: ён вам спадабаецца. Разам з заблытанымі дэтэктывамі там друкуюцца і кансультацыі вядомых юрыстаў краіны па справах непаўналетніх, каменціруюцца крымінальныя законы і прававыя акты. У «Комсомольской правде» нядаўна паявілася рубрыка «Суд ды справа». Чытайце, чытайце з толкам, робячы для сябе адпаведныя вывады. На сёння ўсё. Дзякую за ўвагу. Можа, ёсць пытанні?..

Зноў устае зялёнавокая дзяўчынка:

— А кім вы можаце стаць пасля заканчэння універсітэта?

— Пасля заканчэння мы атрымліваем спецыяльнасць правазнаўцы, працуем у пракуратуры, міліцыі, юрысконсультамі і г. д.

— І следчым таксама?

— Вядома, следчым міліцыі або пракуратуры.

Хлопчыкі, што сядзяць уперадзе, уздыхаюць.

Ужо ў аўтобусе, дзелячыся са мной планамі, Валянцін гаворыць:

— Што пасееш — тое і пажнеш. Дык вось, каб даведацца, што будзе пажата, у час першай сустрэчы прашу вучняў на лісце паперы адказаць на невялікую анкету «Што я ведаю аб законе». На апошняй сустрэчы тая ж працэдура. Пасля параўноўваю і прыходжу да вываду, што нездарма чытаюцца гэтыя лекцыі.

— Першае выступленне, першая лекцыя, першы экзамен — усё першае цяжка. Ты ўжо прачытаў 28 лекцый. Якая з іх для цябе была самай цяжкай?

— Вядома, першая.

В. ГАМАНЮК.
«Савецкі юрыст».

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТА ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

● На харэаграфічным, хормайстарскім, лектарскім і іншых аддзяленнях факультэта грамадскіх прафесій наступіла напружаная перадэкзаменацыйная пара.

● 17 мая кафедра педагогікі і псіхалогіі універсітэта, камітэт камсамола БДУ і філалагічны факультэт правялі навукова-тэарэтычную канферэнцыю, прысвечаную 50-годдзю піянерскай арганізацыі. У ёй прынялі ўдзел слухачы аддзялення піянерскіх важатых.

Стэнды, прадстаўленыя ў гуманітарным корпусе, адлюстроўваюць шэфскую работу калектыву універсітэта ў піянерскіх дружынах.

● 19 мая на рэжысёрскім аддзяленні экзамен. Слухачы дадуць справаздачу аб ведах, атрыманых па сваёй грамадскай прафесіі.

● 17—19 мая праводзяцца заняткі на аддзяленні лектараў па тэме «Псіхолага-педагагічныя аспекты лекцыйнай прапаганды». Размова прысвячаецца ролі лектара ў арганізацыі ўвагі і ўспрымання слухачоў, шляхам і сродкам арганізацыі разумення і запамінання лекцыйнага матэрыялу. З лекцыяй выступае дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Р. І. Вадэйка.

М. МАЦЕЙКА.

У КРЭПАСЦЬ НАД БУГАМ

Заўтра 130 замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта адправяцца ў экскурсійную паездку ў горад Брэст і крэпасць-герой.

Замежныя студэнты з 8 краін свету ўпершыню пазнаёмяцца з гераічным мінулым цытадэлі над Бугам.

Там, на свяшчэннай зямлі, яны сустрэнуцца з жывымі сведкамі падзей, удзельнікамі абароны крэпасці, наведаюць музей, ускладуць вянкі ля Вечнага агню, пройдуць па месцах былых баёў.

За час падарожжа па гораду студэнты пабываюць у краязнаўчым музеі і наведаюць парк культуры і адпачынку.

У суботу вечарам у Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце адбудзецца вечар інтэрнацыянальнай дружбы.

К. ВАСІЛЬЕЎ.

ІДЗЕ АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ

ДЫЯЛОГ

У апошні час перыядычны друк вялікую ўвагу ўдзяляе пытанням эстэтычнага выхавання. Паспрабуем і мы ўнесці сваю лепту. Бо не сакрэт, што ў некаторых нашых студэнтаў яшчэ нізкі культурны ўзровень. І не толькі ў асяроддзі малодшакурснікаў, але і выпускнікоў, людзей, якія хутка могуць стаць на чале калектываў.

Адзін з найбольш кранаючых бакоў — культура мовы. Выкладчыкі грамадскіх дысцыплін, якія вядуць семінарскія заняткі, скардзяцца, што студэнты або завучваюць падручнік амаль даслоўна, або нічога не могуць сказаць. Звяртае на сябе ўвагу няздольнасць некаторых студэнтаў аргументаваць свае выказванні, а таксама няўменне праналізаваць выступленне таварыша. Трэба адзначыць, што і выкладчыкі не заўсёды падаюць прыклад красамоўства. Таму, калі мы хочам што-небудзь папраўіць, неабходна сумесная работа як выкладчыкаў, так і студэнтаў.

Газета «РЛЗ» звяртаецца да дэканата, грамадскіх арганізацый факультэта, выкладчыкаў і студэнтаў з заклікам правесці на факультэце месячнік культуры мовы. Думаем, што за гэта агітуе і вось гэты дыялог, падслуханы нашым карэспандэнтам.

— Хо-го! Каго я бачу! Колькі год!.. Здарова!

— Прывет, чувак! Ну, як ты там, трави! Як жывеш? Гэта ж трэба, столькі не бачыліся... Ты адкуль?

— Ды вось, пашамаў трохі.

— Я таксама рашыў перакусіць. З раніцы ў роце, акрамя газіроўкі, нічога не было.

— Ай, позна ты выбраўся. У кубінцы чарадзюга здаравенная, а на кухні жуваць нечага, адны памыі, а не жрачка.

— Не памятаю ўжо, калі цябе тут бачыў. Куды накіроўваешся?

— Трэба шэфу вочы памазоліць. Курсавую ўзяў і цэлы месяц на заняткі не заяўляўся.

— А я свайму ўжо тры разы здаваў. Не бярэ, дапрацаваць, гаворыць, трэба... Ты ўчора хакей глядзеў?

— Глядзеў. Сал-лагі. Чэхам у адну касу прадулі. Яшчэ Фірсава выгналі. Н-наватары! Балбесы!

— На футбол думаеш пайсці?

— На гэтых сланоў глядзець? Яны ж мяча баяцца, а яшчэ іграць лезуць.

— Ч-чорт! Экзамен заўтра здаю.

— У мяне таксама «кванты» гараць. 80 гадзін і адны формулы.

— Ну, ты давай чапай, а то кармакухню закрыюць.

— І на самай справе. Пабягу. Пакуль! Не забывай наш край.

— Будзь!

— Прыемна ўсё-такі пагутарыць з цікавым чалавекам.

ПРЭМ'ЕРА ТЭАТРА

ПРЫСВЕЧАНА СУЧАСНІКУ

ЭЦЮД.

Фота М. РАСОЛЬКІ, студэнта І курса журфака.

Прэм'еру спектакля па п'есе Л. Жухавіцкага «Адны, без анёлаў» паказаў нядаўна студэнцкі тэатр БДУ. Пастаноўку ажыццявіў рэжысёр тэатра, заслужаны артыст Латвійскай ССР А. М. Озераў.

— Я прапанаваў калектыву некалькі п'ес. Спыніліся на гэтай, прысвечанай сучаснікам, — гаворыць А. М. Озераў.

Аб чым п'еса? Пра ўрача, што ўзначальвае клініку і вядзе навуковы пошук у барацьбе супраць хваробы, перад якой яшчэ бяссільны людзі. Вельмі вялікае жаданне вярнуць хворым жыццё прымушае Сяргея падпарадкаваць усяго сябе гэтай мэце. Ён не фанатык, бо яму хацелася б жыць інакш, але сумленне не церпіць кампрамісаў, калі трэба зрабіць выбар. Менавіта таму не ўдалося яго асабістае шчасце. Жанчына, якую ён пакахаў, не змагла жыць яго суровым жыццём. Ён застаўся адзін, не здрадзіўшы сваёй справе, сумленню, перакананням.

Сяргей у выкананні А. Касцецкага знешне стрыманы, цалкам адданы навуковай працы, вельмі чулы ў абыходжанні са сваімі пацыентамі. Ён чалавек са сваім разуменнем сэнсу, мэты жыцця і шчасця. Артыст стварае вобраз свайго героя без усякіх прыкрас, імкнучыся праўдзіва вылучыць рысы яго характару, паказаць асобу, якая цвяроза ацэньвае жыццё і ўласную адказнасць перад ім. А. Касцецкі прымушае верыць у Сяргея, у яго ўпартасць і талент, у яго высакародную мэту.

Ад жанчыны, якая вырашыла быць жонкай такога чалавека, як Сяргей, патрабуецца многае. І ў першую чаргу ўменне жыць яго інтарэсамі, зразумець, што справа, якой займаецца Сяргей, патрабуе яе дапамогі і падтрымкі, і ёй непазбежна прыйдзецца ахвяраваць дзеля мужа сваімі інтарэсамі. А Валерыя (каханая Сяргея) эгаістычная ў сваім разуменні быць каханай. Ролю Валерыі выконвае студэнтка II курса філалагічнага факультэта Н. Пекарская. Яе Валерыя, вельмі лірычная, абаяльная, крыху саркастычная, са своеасаблівай ацэнкай людзей і з'яў, — спадабалася гледачам.

Другая сюжэтная лінія п'есы — узаемаадносіны Косці са сваімі таварышамі. Ролю Косці выконвае студэнт матэматычнага факультэта А. Зартайскі. Косця лічыў раней, што ён абавязкова зробіць нешта сваё ў архітэктуры. Прайшлі гады, але надзеі не збыліся. Чаму? Няма ў Косці ўпартасці ў працы, няма і вызначанай мэты, як у Сяргея. Ён адчувае, што яго жыццё нейкае няпоўнае, няма ў ім галоўнага: справы, дзеля якой жывеш, якая дапамагае жыць табе.

Разам з тым, у Косці ёсць і станоўчыя рысы: яго нязмерная дабрата і чуласць да людзей. Дзе Косця, там смех і добры настрой. Жарт—гаспадар у яго адносінах з людзьмі. А ў цяжкую хвіліну Косця заўсёды прыйдзе на дапамогу, нават калі яго і не просяць.

У такім плане выконвае ролю Косці А. Зартайскі. Трэба адзначыць яго ўменне свабодна трымацца на сцэне, што ўзмацняе кантакт з гледачамі. Амаль кожная сцэна з яго ўдзелам заканчвалася апладысментамі.

Ролю Галі выконвае Л. Дубікава. У дзень святкавання 15-годдзя гэта дзяўчынка заўважыла чалавечую прыгажосць Косці. Праўдзіва перажывае на сцэне першае каханне — гэта светлае пачуццё, якое ў кожнага ў жыцці пакідае свой след, гераіня Л. Дубікавай. Яе шчырасць, лірычнасць, непасрэднасць робяць вобраз Галі запамінальным.

Хочацца адзначыць, што артысты, якія прынялі ўдзел у спектаклі, стварылі добры ансамбль. Кожны з іх паасобку ўнёс у спектакль тое, што і называюць творчым духам. У гэтым заслуга рэжысёра А. М. Озерава і яго памочніка Л. Цішковай.

Прэм'ера ўдалася. Значыць, спектакль атрымаў пуцёўку ў жыццё.

А. ЦЫГАНКОВА.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 01212
Зак. 598.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. **Тыраж 2 000 экз.**